Таким образом, реализация концепции обучения магистрантов информационным технологиям, основанной на использовании интегрированных образовательных и информационных инноваций, позволяет повысить качество подготовки научных кадров и сформировать устойчивую мотивацию их использования в профессиональной деятельности.

**І. М. Грамовіч,** *дэкан факультэта музычнага мастацтва, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

## ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД У АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ НА ПЕРШАЙ СТУПЕНІ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Сучасныя тэндэнцыі айчыннай музычнай адукацыі адлюстроўваюць працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, змяненні ў патрабаваннях да падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з сацыяльнымі і культурнымі пераўтварэннямі ва ўмовах агульнага рэфармавання вышэйшай школы.

Сур’ёзныя праблемы канкурэнтаздольнасці, прэстыжнасці патрабуюць ад выпускнікоў музычнага факультэта немалых намаганняў, каб застацца запатрабаванымі ў сферы культуры, навукі, адукацыі і шоу-бізнесу. У сувязі з гэтым сучасная сістэма вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы спецыялістаў павінна быць накіравана не толькі на назапашванне тэарэтычнай базы, але і на фарміраванне практычных навыкаў па абранай спецыяльнасці. Пастаянна павышаюцца патрабаванні да якасці работы, фарміравання чалавечых якасцей, узроўню кампетэнцый. Ставіцца задача абнаўлення прафесійнай адукацыі на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення яе практычнай накіраванасці. Праблема прафесійнай падрыхтоўкі кадраў на факультэце музычнага мастацтва паказвае, што прынцыповым з’яўляецца яе практыка-арыентаваны характар.

Ідэя практыка-арыентаванага падыходу вырашаецца на дзяржаўным узроўні не толькі ў нашай краіне, але і ў краінах СНД. Аб гэтым сведчаць распрацоўкі такіх навукоўцаў, як А. А. Цхай, І. М. Кандрацьева, І. С. Аврамкава, І. Б. Курнатава, І. Ю. Калугіна, Э. Ф. Зеер, В. Г. Севераў, А. М. Бялова і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследчыкі, не абыякавыя да праблемы ў навучанні, тлумачаць сутнасць практыка-арыентаванага падыходу. Гэта такі від навучання, які прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў уменняў і навыкаў практычнай работы, неабходных у сферы прафесійнай дзейнасці, а таксама разумення таго, дзе, як і для чаго атрыманыя ўменні ўжываюцца на практыцы. Асноўнай задачай такога падыходу з'яўляецца падрыхтоўка спецыяліста такім чынам, каб ён змог бы без праблем, актыўна, з разуменнем уключацца ў працоўны працэс, выкарыстоўваючы веды і кампетэнцыі, атрыманыя ў час навучання і ў адпаведнасці з атрыманай кваліфікацыяй [4, с. 49].

Перад выкладчыкам стаіць задача так арганізаваць вучэбны працэс, каб ён стаў пазнавальным і творчым, пры якім вучэбная дзейнасць студэнта стала б паспяховай, а веды – запатрабаванымі. Для трывалага засваення ведаў неабходна сфарміраваць зацікаўленасць да вывучаемага матэрыялу.

Актуальнасць распрацоўкі практыка-арыентаванага падыходу ў навучанні заключаецца ў тым, каб значна павысіць эфектыўнасць навучання, у выніку якога:

– павышаецца асабісты статус студэнта і практыка-арыентаванага зместу вывучаемага матэрыялу;

– пастаянна прысутнічае зваротная сувязь у працэсе ўзаемадзеяння студэнт–выкладчык;

– развіваецца сістэма зацікаўленасці да навучання;

– павышаецца самастойнасць і творчы патэнцыял студэнта.

Практыка-арыентаваны падыход у навучанні на першай ступені атрымання адукацыі можа адбывацца ў два этапы:

– першы этап адлюстроўвае працэс навучання і праходжанне ўсіх відаў практык з мэтай знаёмства з прафесійнай дзейнасцю;

– другі этап звязаны з фарміраваннем у студэнтаў кампетэнцый, якія б забяспечвалі выкананне вучэбных заданняў, прадугледжаных вучэбнай праграмай па практыцы.

Магчымасці практыка-арыентаванага падыходу ў арганізацыі адукацыйнага працэсу ў вобласці музычнага мастацтва вызначаюцца шэрагам фактараў, сярод якіх значнымі і актуальнымі для першага этапу прафесійнага станаўлення з'яўляюцца гатоўнасць выкладчыкаў інтэграваць эфектыўныя мадэлі прафесійнай падрыхтоўкі, а таксама іх пазіцыя ў адносінах іх мэт, спецыфікі і характару музычнай дзейнасці, неабходнай будучаму спецыялісту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У шэраг адукацыйных магчымасцей уключаюцца наступныя рысы практыкі:

– магчымасць праходзіць практыку ў перспектыўных і прэстыжных установах культуры і творчых калектывах;

– уключэнне часткі заняткаў практыкі ў праграму вучэбных дысцыплін;

– аб’яднанне акадэмічных і практыка-арыентаваных метадаў навучання;

– правядзенне практыкі па спецыяльна распрацаваных праграмах;

– правядзенне выніковай атэстацыі (залік, дыферэнцаваны залік, экзамен, адкрытыя заняткі).

Кіраўніцтва практыкі павінна забяспечвацца вопытным кіраўніком з боку вучэбнай установы.

Неабходна адзначыць, што спецыфіка навучання па музычных спецыяльнасцях ужо часткова арыентавана на канкрэтную практычную дзейнасць. Практыка-арыентаванае навучанне пачынаецца ў вучэбным класе па спецыяльных дысцыплінах на індывідуальных і практычных занятках. Авалоданне поўным комплексам ведаў і прафесійных кампетэнцый адбываецца ў працэсе навучання такім дысцыплінам, як «Аркестравы клас», «Харавы класс», «Выканальніцкае майстэрства», «Вакальны ансамбль», «Інструментальны ансамбль», «Пастаноўка голасу», «Вакал», «Інструментальны ансамбль», «Вакальны ансамбль», «Джазавыя стандарты», «Камп’ютарныя тэхналогіі ў музыцы», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Прафесійная педагогіка», «Псіхалогія» і інш. Паказаныя дысцыпліны даюць тэарэтычны старт для праходжання ўсіх відаў практык, прадугледжаных вучэбным планам. Сярод іх – азнаямляльная практыка, канцэртна-рэпетыцыйная (вытворчая), канцэртна-рэпетыцыйная (педагагічная), пераддыпломная.

На факультэце распрацаваны вучэбныя праграмы ўсіх відаў практык, якія выкарыстоўваюць кіраўнікі практыкі і студэнты. Патрабаванні, мэты і задачы дакладна абазначаны ў адукацыйным стандарце Рэспублікі Беларусь для першай ступені вышэйшай адукацыі.

Так, азнаямляльная практыка прадугледжвае:

– наведванне ўстаноў культуры розных тыпаў і структур кіраўніцтва ўстаноў культуры розных узроўняў;

– знаёмства з метадычнай і творчай работай аматарскіх і прафесійных калектываў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вывучэнне асноўных дакументаў уліку і справаздачнасці базавай установы культуры.

Рэпетыцыйна-канцэртная (вытворчая практыка) накіравана на:

– азнаямленне з дзейнасцю музычных калектываў розных творчых кірункаў;

– аналіз рэпертуару, выканальніцкай манеры, стылю, арганізацыйна-творчай работы, методыкі правядзення рэпетыцый;

– практычную работу ў творчым калектыве па выкананні заданняў кіраўніка практыкі (развучванне музычнага твора, правядзенне рэпетыцый, стварэнне аранжыровак);

– удзел у канцэртнай дзейнасці, вывучэнне дакументацыі;

– забеспячэнне практычнай падрыхтоўкай да самастойнай прафесійнай дзейнасці ў вобласці музычнага выхавання.

Рэпетыцыйна-канцэртная (педагагічная практыка) накіравана на:

– наведванне заняткаў выкладчыкаў па спецыяльных дысцыплінах;

– правядзенне заняткаў самастойна;

– аналіз правядзення заняткаў, распрацоўка плана-канспекта;

– правядзенне адкрытых заняткаў з вучнем у прысутнасці камісіі.

Задачамі педагагічнай практыкі з'яўляюцца:

– выхаванне ў студэнтаў гатоўнасці да ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці выкладчыка музычных дысцыплін;

– фарміраванне ў будучых выкладчыкаў запатрабаванасці ў прафесійнай рэфлексіі;

– развіццё педагагічных здольнасцей у студэнтаў;

– фарміраванне вопыту педагагічнага ўзаемадзеяння з рознымі суб'ектамі вучэбна-выхаваўчага працэсу;

– стымуляванне крэатыўных падыходаў да вырашэння прафесійных праблем музычнай педагогікі;

– уменне самастойна планаваць і праектаваць практычную і вучэбна-выхаваўчую дзейнасць;

– самастойна ажыццяўляць вучэбна-творчую і вучэбна-выхаваўчую работу з удзельнікамі калектываў і навучэнцамі ў адпаведнасці з запланаванымі формамі, метадамі работы, зместам;

– вывучэнне і мэтанакіраванае фарміраванне творчай асобы вучня з улікам яго індывідуальных здольнасцей.

Пераддыпломная практыка з'яўляецца заключным этапам падрыхтоўкі спецыяліста да прафесійнай дзейнасці, мэта якой – завяршэнне фарміравання прафесійных і арганізацыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уменняў праз даследчую, эксперыментальную дзейнасць студэнта ў практычнай частцы дыпломнай работы.

Праблема эфектыўнасці праходжання практыкі ў тым, што не заўсёды выкладчык-кіраўнік ад вучэбнай установы можа пракантраляваць работу студэнта на якасным узроўні. А кіраўнікі баз практык, з якімі заключана дамоўленасць, не зацікаўлены ў паспяховым навучанні практыканта. Яны не знаёмы з праграмай, мэтамі і задачамі практыкі, патрабаваннямі. Асноўны недахоп азнаямляльнай практыкі – пасіўны характар праходжання. І нарэшце, недастатковая эфектыўнасць вытворчай практыкі заключаецца ў адсутнасці магчымасці ў студэнтаў-практыкантаў прымаць самастойныя творчыя рашэнні.

Лагічна меркаваць, што ўдасканаленне практыка-арыентаванага падыходу можа вырашыць частку праблем, дзякуючы стварэнню адукацыйных умоў, якія ўключаюць адказнасць за вынікі практыкі, магчымасць дзейнічаць самастойна ў вырашэнні складаных творчых задач, выкарыстанне вучэбных праграм, стварэнне спецыяльных тэхналогій і методык.

Практыка-арыентаваны падыход у арганізацыі адукацыйнага працэсу на другім этапе мы вызначылі кампетэнтнасным падыходам. Сёння няма адназначнага меркавання наконт паняцця кампетэнтнасці. Пад кампетэнтнасцю, на наш погляд, разумеецца валоданне студэнтамі больш шырокімі, чым самі веды, якасцямі і разуменнямі для паспяховай рэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці. Менавіта таму практыка-арыентаваны падыход накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў прафесійных, агульнакультурных, камунікатыўных і сацыяльна значных кампетэнцый шляхамі набыцця ведаў, уменняў, навыкаў і прафесійнага вопыту. Для будучага спецыяліста ў вобласці музычнага мастацтва вельмі важна валодаць такімі кампетэнцыямі, як:

– музычна-педагагічная, якая прадугледжвае веды методыкі музычнай адукацыі;

– мастацка-эстэтычная, якая фарміруе эстэтычныя густы, запатрабаванні ў сферы развіцця мастацка-вобразнага музычнага мыслення;

– прафесійна-тэхнічная (выканальніцкая), якая прадугледжвае уменне праілюстраваць на музычным інструменце, праспяваць, прадырыжыраваць той ці іншы жэст;

– слоўна-тлумачальная, якая прадугледжвае ўменне расказаць, растлумачыць тэхналогію штрыха ігры на інструменце, тэхналогію жэста ці спеваў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сюды можна аднесці кампетэнцыі ў сферы міжасабовых, інтэрперсанальных кампетэнцый студэнта, кампетэнцыі ў сферы творчага развіцця асобы. Немалаважную ролю адыгрывае і тая акалічнасць, што ў дадзеным адукацыйным працэсе адбываецца фарміраванне асобы спецыяліста, заснаванае на ўцягванні яго творчага патэнцыялу, сіл і здольнасцей. Разам з тым асаблівасцю практыка-арыентаванага падыходу з'яўляецца фарміраванне фундаментальнай навуковай базы ведаў паралельна з атрыманнем практычных кампетэнцый.

Канчатковым вынікам практыкі з'яўляецца спецыяльна распрацаваная на факультэце выніковая мадэль справаздачы і атэстацыі студэнтаў па выкананні і рэалізацыі імі заданняў, атрыманых ад кіраўнікоў практыкі.

Такім чынам, практыка-арыентаваны падыход заключаецца ў пабудове вучэбнага працэсу на аснове адзінства набыцця трывалых ведаў і фарміравання практычнага вопыту з мэтай яго выкарыстання пры вырашэнні творчых задач у прафесійнай дзейнасці. Вельмі важна, каб кампетэнтнасны падыход быў эфектыўным сродкам актывізацыі музычнай адукацыі і прафесійнага станаўлення студэнтаў музычнага факультэта на першай ступены вышэйшай адукацыі.

1. *Белова, А. Н.* Формирование образовательных компетенций студентов вузов культуры и искусств : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / А. Н. Белова ; Моск. гуманитар. ун-т. – М., 2009. – 24 с.

2. *Зеер, Э. Ф.* Компетентностный подход в образовании / Э. Ф. Зеер // Образование и наука. Изв. УрО РАО. – 2005. – № 3 (33). – С. 27–35.

3. *Зеер, Э. Ф.* Модернизация профессионального образования: компетентностный подход / Э. Ф. Зеер // Образование и наука. Изв. УрО РАО. – 2004. – № 3. – С. 42–53.

4. *Северов, В. Г.* Тенденции и проблемы развития профессиональной подготовки практико-ориентированных кадров для сферы малого бизнеса / В. Г. Северов // Науч. исследования в образовании. – 2010. – № 6. – С. 47–54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ